# Пісаць як ёсць

**Пісьмо — гэта лепшае, што можна было прыдумаць у гэтым свеце. Прынамсі, на маю думку. І не толькі таму я так думаю, што маю пэўнае дачыненне да гэтай справы. І зусім не таму, што складаць літары ў словы, а словы ў сказы весела — як думаюць многія.**

*Канстанцін Касяк*



Здавалася б, якія простыя рэчы: асадка, нататнік або адкрыты файлік на камп’ютары ці планшэце. Але ж колькі ўсяго яны даюць!

Не так даўно быў у Вільні, гуляў па горадзе і рэзка захацеў што–небудзь напісаць. Вырашыў не адкладаць, бо потым жа нічога і не напішацца. Яно ж заўсёды так: лёгка і добра напланаваць, а вось ажыццявіць — складана. Колькі ўжо такіх планаў здаралася, а рэалізацыі — вобмаль.

У кожнага з нас сваё разуменне, свой «кодэкс гонару», свае правілы. І не заўсёды шчырая размова можа адбыцца. Проста таму, што для яе трэба набрацца хаця б смеласці

З дзённікам ты можаш быць якім заўгодна: слабым, нямоглым, непрытомным. Або наадварот: героем — нават калі ты вельмі далёкі ад ідэалу. Галоўнае — пісаць як ёсць

Таму зайшоў у бліжэйшую кнігарню, набыў самую што ні ёсць просценькую асадку, невялічкі нататнік і, засеўшы ў «МакДональдсе» на праспекце Гедыміна, спісаў той нататнік дашчэнту літаральна за пару гадзін.

Спачатку думкі прыходзілі хаатычна, згадвалася мінулае, а потым пачаў вымалёўвацца нейкі парадак. Аднекуль з глыбінь памяці пачалі ўзнікаць яскравыя вобразы, як быццам было гэта ўчора, а не многа гадоў таму.

Згадалася, як маці падарыла на нейкае свята, можа, нават на дзень нараджэння, мой першы «дарослы» нататнік. Вялікі, груваслкі, на шмат старонак. І я вырашыў весці ў ім дзённік, акуратна запісваючы тое, што са мною здарылася за мінулы дзень.

Спачатку запісы былі невялічкія, літаральна з некалькіх сказаў, а потым тэксты пачалі расці.

Згадалася, як пад лесвіцай у школе дзяўчынка Оля вучыла мяне цалавацца, бо я не ўмеў. Як найлепшы сябар прыйшоў на досвітку, каб прадаць свой новенькі плэер разам з усімі касетамі — у яго не было грошай на выезд, а «прабіць залаты» сезон за любімую каманду вельмі хацелася. Як упершыню зразумеў, што мая суседка па парце для мяне больш чым аднакласніца. І толькі калі дапісваў гэты калейдаскоп абразкоў–успамінаў,



да мяне дайшло: усе гэтыя гісторыі, або пераважная іх большасць, былі дэтальна апісаныя ў маім тым, юнацкім нататніку. Вядома, ён не захаваўся, і я шкадую пра гэта, бо цяпер з вялікім задавальненнем усё гэта перачытаў бы. Але згадка пра яго пацягнула з нетраў памяці і тое, што я ў яго напісаў.

Дзённік — гэта, бадай, адзінае, дзе можна стварыць свой бестурботны свет. Камфортны і зразумелы. Усталяваць там такія правілы, што потым не будзе няёмка. Вы ж разумееце, пра што я? Далёка не кожны падлетак прызнаецца сябрам, што не ўмее цалавацца. Ды і суседцы па парце прызнацца ў каханні не так і проста. А пра таварышаў, якія сплаванавалі паехаць на футбол, нікому лішняму лепш наогул не ведаць.

У кожнага ў жыцці бываюць такія хвіліны, калі хочацца пагаварыць. Адкрыць, так бы мовіць, душу. Але распавядаць камусьці нешта патаемнае жадання няма. Ды і ўдзячных слухачоў у такіх выпадках звычайна нямнога. Каму цікава слухаць пра чужыя праблемы? Адна справа гаварыць пра пацалункі пад лесвіцай і зусім іншая — пра свае страхі і боль, пра сябе самога. А бывае, што даверыцца цяжка нават самаму блізкаму чалавеку. У кожнага з нас сваё разуменне, свой «кодэкс гонару», свае правілы. І не заўсёды шчырая размова

> Дзённік — гэта, бадай, адзінае, дзе можна стварыць свой бестурботны свет. Камфортны і зразумелы. Усталяваць там такія правілы, што потым не будзе няёмка. Вы ж разумееце, пра што я?

можа адбыцца. Проста таму, што для яе трэба набрацца хаця б смеласці.

У такіх выпадках нататнік з асадкаю — ідэальны варыянт, бо самая шчырая размова можа адбыцца толькі з самім сабою. Кожны чалавек ведае пра свае мінусы, але не кожны адважыцца іх паказаць, раскрыць, паглядзець на сябе з іншага ракурсу. Правесці такі грунтоўны аналіз дарагога каштуе — у прамым сэнсе гэтага слова. А тут за нейкія капейкі можна займець вернага сябра, які ўжо дакладна захавае таямніцы, не разбіраючыся асабліва, драбяза гэта ці нешта глабальнае.

З дзённікам ты можаш быць якім заўгодна: слабым, нямоглым, непрытомным. Або наадварот: героем — нават калі ты вельмі далёкі ад ідэалу. Галоўнае — пісаць як ёсць, тады і думкі слушныя пачнуць з'яўляцца ў галаве.